

**УЛАДЗІМІР ПАЎЛАВІЧ ВЯЛІЧКА**
**(1943 – 2018)**

**11 жніўня 2018 года на 75-м годзе жыцця памёр знакаміты беларускі філосаф, вядомы пісьменнік-публіцыст і таленавіты рэдактар, стваральнік часопісаў «Беларуская думка» і «Белая Вежа» Уладзімір Паўлавіч Вялічка.**

Нарадзіўся Уладзімір Вялічка ў вёсцы Масевічы Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці ў часы Вялікай Айчыннай вайны. Скончыў журфак Белдзяржуніверсітэта. Таксама вучыўся ў Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС. Асвойваў цаліну ў Казахстане, працаваў карэспандэнтам у брэсцкай газеце «Заря». Працаваў з Пятром Машэравым, будучы яго памочнікам да смерці апошняга. У 1980-я гады ўзначальваў калектыў часопіса «Коммунист Белоруссии». Затым у 1991 годзе ўзначаліў часопіс «Беларуская думка». Уладзімір Паўлавіч Вялічка быў удастоены званняў «Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь», «Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь». Дзякуючы прафесійным і асабістым якасцям У.П.Вялічкі часопіс «Беларуская думка» стаў адным з самых аўтарытэтных друкаваных СМІ ў нашай краіне. Уладзімір Паўлавіч Вялічка з'яўляўся членам праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Ён быў адзначаны аўтарытэтнай прафесійнай прэміяй Беларускага саюза журналістаў «Залатое пяро», а затым уваходзіў у камітэт па прысуджэнні гэтай прэміі. У апошнія гады Уладзімір Паўлавіч працаваў у рэдакцыі іншага часопіса – «Белая Вежа» – друкаванага органа Саюза пісьменнікаў Саюзнай Дзяржавы. Апошнім творчым дасягненнем Уладзіміра Вялічкі стала кніга «Пётр Машэраў. Беларусь – яго песня і слава», якая выйшла ў 2018 годзе.

Падчас працы над публікацыямі ў часопісах літаратарам Гродзеншчыны пашчасціла пазнаёміцца з Уладзімірам Паўлавічам. Для ўсіх нас ён быў прыкладам сапраўднага творчага інтэлігента, чалавека ў вышэйшай ступені ветлівага і тактоўнага, сапраўднага гуманіста, шчырага патрыёта Беларусі, які аддаў усяго сябе без астатку справе фарміравання духоўна-інтэлектуальнага патэнцыялу нашага грамадства. Сёння з-за гэтай незаменнай страты – смерці нашага сапраўднага сябра, настаўніка, калегі болем і смуткам перапоўнены нашы сэрцы. Светлая памяць аб Уладзіміры Паўлавічу Вялічку назаўжды застанецца ў іх.

**Калектыў Гродзенскага абласнога аддзялення**
**Саюза пісьменнікаў Беларусі**